# Акцыя “Наш паклон вам, ветэраны!” праходзіць у Ашмянскім раёне.

Хутка бяжыць час. Далёкім рэхам адгукаюцца ў сэрцах землякоў падзеі ваеннага ліхалецця. На жаль, сыходзяць нашы ветэраны… Але мы, нашчадкі, ніколі не забываем гераічны подзвіг нашых дзядоў і прадзедаў. Вось і сёння кажам шчыры “дзякуй” за мірнае неба над галавой і вольнае жыццё.

Па традыцыі напярэдадні Дня Перамогі спецыялісты тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага раёна разам з дырэктарам Ліліяй Невяркевіч арганізавалі святочную акцыю “Наш паклон вам, ветэраны!”. Да іх далучыліся актывістаў БРСМ і вучні Ашмянскай школы мастацтва, а таксама наведвальнікі аддзяленняў цэнтра. Вялікай і дружнай кампаніяй яны завіталі ў госці да ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. . Шмат цёплых слоў віншавання з надыходзячым святам, слоў удзячнасці за мірнае жыццё, пажаданняў моцнага здароўя прагучала для іх у гэты дзень. Падарункі, кветкі, паштоўкі, а галоўнае ўвага і клопат аб старэйшым пакаленні вельмі расчулілі і парадавалі ветэранаў. Юныя баяністы Уладзіслаў Корсікаў, Юрый Барташэвіч і Ганна Крыніцкая разам са сваім выкладчыкам Галінай Адамаўнай Крыніцкая выканалі некалькі кампазіцый на баяне. Ім дружна падпявалі і ветэраны Айчыннай вайны, якія хавалі ледзь прыкметныя слёзы.







